

# Параўнальны аналіз аказання псіхалагічнай дапамогі зняволеным у пенітэнцыярных сістэмах Беларусі і Эстоніі: рэкамендацыі для беларускай сістэмы

Вольга Вялічка

**2024 год**

Беларусь знаходзіцца на першым месцы ў Еўропе і адзінаццатым у свеце па колькасці зняволеных. У краіне функцыянуе больш за 60 месцаў пазбаўлення волі, у якіх утрымліваецца больш за 35 тысяч чалавек. Каля 1,5 тысячы асуджаных праваабаронцы прызналі палітвязнямі, аднак рэальная лічба можа быць і вышэйшай – улады хаваюць інфармацыю пра палітычныя працэсы.

Псіхалагічная дапамога зняволеным у Беларусі, як і ў іншых краінах, з'яўляецца важнай часткай сістэмы папраўчага ўздзеяння, але ў рэальнасці яна можа сутыкацца з шэрагам праблем, такіх як абмежаваныя рэсурсы, адсутнасць спецыялістаў і жорсткія ўмовы ва ўстановах.

У Беларусі аказанне псіхалагічнай дапамогі зняволеным рэгулюецца шэрагам законаў, нарматыўных актаў і падзаконных дакументаў. Галоўная мэта гэтых нарматыўных актаў - забяспечыць права зняволеных на атрыманне медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі, а таксама стварыць умовы для іх рэабілітацыі і сацыяльнай адаптацыі. Аднак, нягледзячы на наяўнасць прававых асноў, на практыцы якасць і даступнасць псіхалагічнай дапамогі зняволеным у краіне сутыкаюцца з шэрагам праблем.Больш за тое, у публічныай прасторы маюцца шматлікія сведчанні відавочнага парушэння закона і выкарыстоўвання  псіхолагаў у якасці дадатковых карных метадаў.

## Міжнародныя стандарты і праваабарончыя патрабаванні

Беларусь, як член шэрагу міжнародных арганізацый, падпісала розныя міжнародныя пагадненні, такія як Міжнародны пакт аб грамадзянскіх і палітычных правах, Канвенцыя супраць катаванняў і іншых жорсткіх, бесчалавечных або прыніжаючых годнасць відаў абыходжання і пакарання і іншыя, якія абавязваюць забяспечваць зняволеных доступам да медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі.

Аднак на практыцы існуе мноства скаргаў праваабарончых арганізацый аб тым, што правы зняволеных у Беларусі на доступ да медыцынскай  і псіхалагічнай дапамогі часта парушаюцца. Асабліва гэта датычыцца палітычных зняволеных і тых, хто падвяргаецца жорсткаму абыходжанню або псіхалагічнаму ціску з-за сваёй гармадзянскай пазіцыі пасля 2020 года.

## Роля праваабарончых арганізацый

Праваабарончыя арганізацыі ў Беларусі і за мяжой актыўна маніторыць умовы ўтрымання зняволеных і дапамогу, якую яны атрымліваюць. Яны часта крытыкуюць сістэму за нізкую якасць псіхалагічнай  дапамогі і за той факт, што псіхолагі ў турмах часта не маюць магчымасці праводзіць незалежныя кансультацыі і падтрымліваць канфідэнцыйнасць.

Міжнародныя арганізацыі, такія як Amnesty International і Human Rights Watch, звяртаюць увагу на парушэнні правоў зняволеных у Беларусі і актыўна змагаюцца за паляпшэнне ўмоў іх утрымання, уключаючы доступ да псіхатэрапеўтычнай дапамогі.

## **Нацыянальнае заканадаўства, якое рэгулюе аказанне псіхалагічнай дапамогі**

1. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь.

Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь (у прыватнасці, артыкул 23) гарантуе грамадзянам права на ахову здароўя, у тым ліку права на медыцынскую дапамогу. Гэтае права распаўсюджваецца і на зняволеных, у тым ліку на прадастаўленне псіхалагічнай дапамогі. Аднак дэталі рэалізацыі гэтага права для зняволеных удакладняюцца ў іншых нарматыўных актах.

2. Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь.

Асноўным дакументам, які рэгулюе рэжым утрымання і права зняволеных, з'яўляецца Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь (КВК). Гэты кодэкс устанаўлівае, што зняволеныя маюць права на медыцынскую дапамогу, у тым ліку псіхалагічную, як неад'емную частку агульнай сістэмы медыцынскага абслугоўвання ў месцах пазбаўлення волі. Ва КВК замацоўваецца права асуджаных на атрыманне псіхіятрычнай дапамогі ў выпадку неабходнасці, а таксама права на кансультацыі з псіхолагам для падтрымання псіхаэмацыйнага стану.

Артыкул 120 УВК:

Крымінальна-выканаўчы кодэкс прадугледжвае, што асуджаныя маюць права на атрыманне медыцынскай дапамогі, у тым ліку і псіхіятрычнай, у выпадку, калі псіхічны ці фізічны стан патрабуе ўмяшання.

У адпаведнасці з гэтым, псіхатэрапеўтычныя паслугі могуць быць прадастаўлены зняволеным на падставе паказанняў урачоў, а псіхолагі працуюць у сістэме крымінальна-выканаўчых устаноў у якасці часткі медыцынскай службы.

3. Закон аб ахове здароўя.

Закон Рэспублікі Беларусь "Аб ахове здароўя" рэгулюе аказанне медыцынскай дапамогі ў краіне, у тым ліку пытанні псіхіятрычнай і псіхалагічнай дапамогі ў месцах пазбаўлення волі. У прыватнасці, закон вызначае асноўныя прынцыпы арганізацыі аховы здароўя, а таксама ўказвае на неабходнасць забеспячэння даступнасці медыцынскіх і псіхіятрычных паслуг для ўсіх грамадзян, уключаючы зняволеных.

Артыкул 14 закона:

Псіхалагічная дапамога прадастаўляецца на *аснове прынцыпу даступнасці і добраахвотнасці* для ўсіх грамадзян, уключаючы зняволеных, ва ўстановах аховы здароўя, у тым ліку спецыялізаваных псіхіятрычных установах.

4. Нарматыўна-прававыя акты Міністэрства юстыцыі і Міністэрства аховы здароўя.

Загады і распараджэнні Міністэрства юстыцыі рэгулююць арганізацыю работы ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы, у тым ліку пытанні, звязаныя з медыцынскай дапамогай. Важна, што яны часта ўдакладняюць правілы, паводле якіх зняволеныя могуць атрымліваць кансультацыі псіхолагаў і псіхіятраў.

Загады Міністэрства аховы здароўя рэгулююць парадак арганізацыі медыцынскага абслугоўвання, у тым ліку псіхалагічнай і псіхіятрычнай дапамогі. Напрыклад, існуе рэгламент па дыягностыцы і лячэнні псіхічных захворванняў у зняволеных, а таксама працэдура накіравання на абследаванне і лячэнне ў псіхіятрычныя ўстановы.

## Правы зняволеных на псіхалагічную дапамогу і стандарты

Заканадаўства, якое рэгулюе працу сістэмы папраўчых установ, таксама ўстанаўлівае правы зняволеных на атрыманне розных відаў медыцынскай дапамогі, у тым ліку псіхалагічную. Аднак працэдуры аказання псіхалагічнай дапамогі могуць вар'іравацца ў залежнасці ад установы і могуць не заўсёды адпавядаць як міжнародным, так і нацыянальным стандартам. Адсутнасць адзінага сістэмнага падыхода стварае рознасць стандартаў аказання псіхалагічнай дапамогі за кратамі ў Беларусі нягледзячы на існуючае заканадаўства.

## Арганізацыя псіхалагічнай дапамогі ў беларускіх турмах

У Беларусі асноўную псіхалагічную дапамогу зняволеным аказваюць супрацоўнікі, якія працуюць у папраўчых установах, а таксама часам прыцягваюцца іншыя псіхолагі/псіхіятры і спецыялісты, калі ёсць неабходнасць і загад начальніка папраўчай установы.

*Асноўныя формы псіхалагічнай дапамогі: як гэта мусіць прававаць у Беларусі*

Індывідуальныя кансультацыі псіхолага. У беларускіх папраўчых установах працуюць псіхолагі, якія праводзяць індывідуальныя сесіі са зняволенымі. Такія кансультацыі звычайна накіраваны на вырашэнне псіхаэмацыянальных праблем, стрэс, дэпрэсію, агрэсію і іншыя паводніцкія і псіхалагічныя расстройствы. Псіхолагі таксама дапамагаюць зняволеным адаптавацца да ўмоў ізаляцыі.

Групавыя трэнінгі і заняткі. Некаторыя ўстановы праводзяць групавыя заняткі, дзе зняволеныя могуць навучацца навыкам зносін, вырашэнню канфліктаў і стрэсаўстойлівасці, напрыклад у ПК 2, ПК 4, ПК 11. Гэта таксама дапамагае ім лепш спраўляцца з цяжкасцямі, звязанымі з сацыяльнай ізаляцыяй.

Псіхалагічная дыягностыка. У рамках псіхалагічнай дапамогі зняволеным праводзіцца дыягностыка іх псіхаэмацыйнага стану. Гэта дапамагае выявіць праблемы, такія як дэпрэсія, агрэсія, суіцыдальныя схільнасці і іншыя псіхічныя расстройствы. Такія дыягнастычныя працэдуры асабліва важныя для тых, хто можа знаходзіцца ў групе

рызыкі. Псіхадыягнастычны інстументарый прапісаны ў пастонове Міністэрства аховы здароўя нашай краіны.

Праца з агрэсіяй і адаптацыя. Псіхолагі працуюць са зняволенымі, каб дапамагчы ім спраўляцца з агрэсіяй і імпульсіўнымі паводзінамі. Праграмы для такіх зняволеных могуць уключаць трэніроўкі па кантролі гневу, паляпшэнню навыкаў зносін і кіравання эмоцыямі.

Рэабілітацыйныя праграмы. Некаторыя папраўчыя калоніі  праводзяць спецыялізаваныя рэабілітацыйныя праграмы для зняволеных, накіраваныя на аднаўленне іх псіхаэмацыйнага стану і падрыхтоўку да жыцця пасля вызвалення. Гэтыя праграмы могуць уключаць курсы сацыяльнай адаптацыі, псіхатэрапію і трэнінгі па працаўладкаванні. Дакладна вядома пра такія праграмы ў ПК 2 і ПК 11.

Некаторыя зняволеныя могуць атрымаць дапамогу праз праграмы рэабілітацыі і рэсацыялізацыі, арганізаваныя грамадскімі і рэлігійнымі арганізацыямі, але такія праграмы могуць быць абмежаваныя ці даступныя толькі ў пэўных установах.

У перыяд 2015-2020 гадоў у краіне  паўставалі шматлікія ініцыятывы і арганізацыі па псіхатэрапеўтычнай дапамозе зняволеным, накіраваныя на аднаўленне псіхалагічнага стану людзей, якія пацярпелі ад жорсткага абыходжання. Грамадскія арганізацыі накіроўвалі свае намаганні на вырашэнне праблем пасля вызвалення, пошук працы, а таксама самазанятасці беларусаў, якія вызваліліся. Аднак, пасля падзей 2020 года і татальнай зачысткі грамадсткага сектара, у краіне амаль не засталося грамадскіх аб’яднанняў, якія маюць доступ да зняволеных. Усе гэтыя аб'яднанні маюць статус ГОНГА, яркім прыкладам з’яўляецца Чырвоны крыж.

## Праграмы, арыентаваныя на рэсацыялізацыю

Некаторыя папраўчыя ўстановы ў Беларусі прапаноўвалі да 2020 года праграмы, накіраваныя на рэсацыялізацыю зняволеных пасля выхаду з турмы, напрыклад ПК 2 у Бабруйску, аддзел для непаўналетніх. Такія праграмы ўключалі:

- навучанне жыццёвым навыкам: у рамках гэтых праграм зняволеным дапамагаюць развіць навыкі, якія неабходныя для нармальнага жыцця на свабодзе. Гэта можа быць навучанне камунікацыі, кіраванню эмоцыямі, пошуку працы і т. д.;
- псіхалагічная дапамога пры падрыхтоўцы да вызвалення: зняволеным прапануюцца кансультацыі па адаптацыі да жыцця на свабодзе, пераадоленні стрэсу і вырашэння праблем з сацыяльнай рэабілітацыяй.

## Прыкладная схема атрымання псіхалагічнай дапамогі зняволеным:

Зняволены можа звярнуцца па дапамогу да медыцынскага персаналу папраўчай установы.

Псіхолаг або псіхіятр праводзяць першасную дыягностыку стану зняволенага. Важна разумець, што такая праца можа і мусіць выконвацца толькі пасля атрымання ПІСЬМОВАЙ згоды зняволенага. *Прынцып дабраахвотнасці* з’яўляецца першым неабходным да выканання як заканадаўчых патрабаванняў, так і прафісійных.

У выпадку неабходнасці, зняволенага накіроўваюць на глыбейшае абследаванне ці спецыялізаванае лячэнне ў псіхіятрычную лякарню.

## Агульныя праблемы аказання псіхалагічнай дапамогі беларусам у зняволенні

Нягледзячы на наяўнасць праграм псіхалагічнай дапамогі, у беларускіх турмах існуе шэраг праблем, якія абмяжоўваюць эфектыўнасць такой дапамогі:

**Недахоп спецыялістаў**. Колькасць псіхолагаў у папраўчых установах у Беларусі абмежавана, што ўскладняе паўнацэнную работу са зняволенымі. Многім установам не хапае кваліфікаваных спецыялістаў, а тыя, хто ёсць, часта перагружаны працай.

**Жорсткія ўмовы ўтрымання.** Умовы ў беларускіх турмах вельмі складаныя: перапоўненасць, недахоп рэсурсаў, дрэнныя ўмовы для правядзення тэрапіі. Гэтыя фактары робяць працу псіхолагаў менш эфектыўнай, бо падтрыманне псіхаэмацыйнага стану зняволеных у такіх умовах патрабуе значна больш намаганняў.

**Палітычныя і праваабарончыя аспекты.** Ва ўмовах, калі правы чалавека, у тым ліку правы зняволеных, катастрафічна абмежаваныя, псіхалагічная дапамога часта выкарыстоўваецца ў тым ліку для маніпуляцый са зняволенымі (напрыклад, для выяўлення палітычнай актыўнасці або выяўлення "непажаданых").

**Адсутнасць прыватнасці.** Часта псіхалагічныя кансультацыі і гутаркі праводзяцца ва ўмовах, калі зняволеныя не маюць поўнай канфідэнцыйнасці. Гэта можа змяншаць адкрытасць і гатовасць абмяркоўваць асабістыя і балючыя тэмы.

Заканадаўства Беларусі рэгулюе аказанне псіхалагічнай дапамогі зняволеным, у тым ліку праз крымінальна-выканаўчы кодэкс і іншыя нарматыўныя акты. Аднак, на практыцы існуе мноства праблем, такіх як недахоп спецыялістаў, нізкая якасць і недахоп рэсурсаў, якія абмяжоўваюць даступнасць і эфектыўнасць псіхалагічнай дапамогі. Беларускія праваабаронцы і міжнародныя арганізацыі актыўна сочаць за выкананнем правоў зняволеных на медыцынскую і псіхалагічную дапамогу, што на сёняшні дзень не моцна ўплывае на развіццё гэтай сферы ў краіне.

## Праблемы і абмежаванні існуючых пісхалагічных праграм для зняволеных пасля падзей 2020 годзе ў Беларусі

Нягледзячы на існуючыя праграмы, у Беларусі ёсць шэраг праблем, якія абмяжоўваюць іх эфектыўнасць:

- Недахоп спецыялістаў. Колькасць псіхолагаў ва ўстановах абмежавана, а нагрузка на іх вялікая. Часам псіхолагі не паспяваюць працаваць з кожным зняволеным ці праводзіць рэгулярныя сесіі. Праца псіхологага накіраваная на атрыманне пісьмовых дазволаў на аказанне псіхалагічнай дапамогі, складанне характарыстык, падпісанне актаў, якія тычацца псіхалагічных станаў зняволеных. Усё гэта носіць фармальны падыход да працы, а часта і выкарыстанне псіхолагаў для аказання ціску на людзей за кратамі.
- Недахоп фінансавання. Праграмы псіхалагічнай дапамогі часта не атрымліваюць належнага фінансавання, што абмяжоўвае даступнасць паслуг для зняволеных.
- Адсутнасць канфідэнцыйнасці. Ва ўмовах зняволення часта адсутнічае паўнавартасная канфідэнцыяльнасць пры правядзенні псіхалагічных сесій, што змяншае эфектыўнасць працы, паколькі зняволеныя могуць не раскрываць свае рэальныя праблемы.
- Сацыяльна-псіхалагічныя праблемы. Ва ўмовах жорсткай ізаляцыі, недахопу сацыяльнай і эмацыйнай падтрымкі зняволеныя могуць сутыкнуцца з сур'ёзнымі псіхалагічнымі праблемамі, якія могуць патрабаваць спецыялізаванай дапамогі, якой у большасці калоній няма.
- Палітычныя і праваабарончыя аспекты. У Беларусі палітычныя зняволеныя і тыя, хто трапляе пад рэпрэсіі, часта сутыкаюцца з дадатковымі цяжкасцямі, звязанымі з псіхалагічным ціскам, а праграмы псіхалагічнай дапамогі для такіх людзей могуць быць абмежаваныя ці падвяргацца кантролю аператыўгана адзела калоніі.

Псіхолагі ў пенітэнцыярных установах Беларусі сутыкаюцца з шэрагам праблем, якія абмяжоўваюць іх здольнасць эфектыўна дапамагаць асуджаным. Гэтыя праблемы падобныя да тых, з якімі сутыкаюцца турэмныя псіхолагі ў іншых краінах, але ў Беларусі яны могуць мець свае асаблівасці, звязаныя з палітычнай сітуацыяй, сацыяльным асяроддзем і абмежаванасцю рэсурсаў.

**Асноўныя праблемы псіхолагаў у беларускіх турмах:**

1. Недахоп рэсурсаў і кадраў

Перагрузка спецыялістаў: у беларускай пенітэнцыярнай сістэме існуе дэфіцыт псіхолагаў, што прыводзіць да перагрузкі існуючых спецыялістаў. Адзін псіхолаг можа абслугоўваць вялікую колькасць асуджаных, што абцяжарвае правядзенне якаснай індывідуальнай працы і дае менш магчымасцяў для ўдзелу ў рэабілітацыйных і адукацыйных праграмах.

Абмежаваныя магчымасці для навучання: не заўсёды існуе дастатковая колькасць праграм для павышэння кваліфікацыі спецыялістаў, што абмяжоўвае магчымасці псіхолагаў для працы з асуджанымі, асабліва з тымі, хто мае спецыфічныя праблемы, такія як псіхічныя расстройствы, залежнасць ад наркотыкаў або алкаголю.

2. Псіхалагічная нагрузка і выгаранне

Праца з асуджанымі, асабліва ва ўмовах беларускіх турмаў, можа быць вельмі стрэсавай для псіхолагаў. Эмацыйнае выгаранне - частая праблема сярод спецыялістаў, якія працуюць у гэтай сферы. Гэта натуральна звязана з высокай нагрузкай, абмежаванымі магчымасцямі для адпачынку і адсутнасцю падтрымкі з боку адміністрацыі.  А таксама адсутнасць прафісійнага асяроддзя, у якім можна праходзіць супервізію ці інтэрвізію.

Псіхолагі могуць адчуваць моцны псіхалагічны ціск, працуючы з асуджанымі, якія могуць быць агрэсіўнымі, маніпулятыўнымі або адчуваць сур'ёзныя псіхічныя расстройствы.

3. Складанасці з даверам з боку асуджаных

Недавер да псіхолагаў: асуджаныя часта ўспрымаюць псіхолагаў як частку турэмнай сістэмы, якая кантралюе іх паводзіны. Многія могуць баяцца, што інфармацыя, раскрытая псіхолагу, будзе выкарыстана супраць іх, што зніжае эфектыўнасць псіхалагічнай дапамогі.

Псіхалагічны супраціў: асуджаныя, асабліва тыя, хто здзейсніў цяжкія злачынствы, могуць быць не гатовыя працаваць з псіхолагамі, лічачы гэта залішнім або непатрэбным. Гэта стварае дадатковыя цяжкасці для псіхолагаў, якім даводзіцца шукаць спосабы ўсталяваць даверныя адносіны з кліентамі.

4. Палітычная і сацыяльная сітуацыя

Палітычная рэпрэсія: на працягу практычна пяці гадоў у Беларусі назіраецца рост колькасці палітычных зняволеных. У такіх выпадках псіхолагам даводзіцца працаваць з асуджанымі, чые псіхаэмацыянальныя праблемы могуць быць звязаны з палітычным пераследам, катаваннямі або незаконным зняволеннем. Гэта стварае вялікія дадатковыя складанасці ў псіхатэрапеўтычнай працы. Гэта спрыяе фарміраванню ў турэмных псіхолагаў дэфармацыі і прафнепрыдатнасці, а таксама робіць іх саўдзельнікамі злачынстваў у частцы падтасоўкі палітычна абгрунтаваных крымінальных справаў.

Палітычная нестабільнасць: ва ўмовах палітычнага ціску і адсутнасці грамадскага кантролю праца псіхолагаў у турмах можа падвяргацца дадатковым абмежаванням. Псіхолагі, якія працуюць з асуджанымі па палітычных прычынах, безумоўна сутыкаюцца з дадатковым кантролем з боку адміністрацыі ці калег.

5. Нізкі ўзровень псіхалагічнайадукацыі сярод асуджаных

Многія асуджаныя ў Беларусі могуць не ўсведамляць важнасці псіхатэрапеўтычнай дапамогі і не гатовы да псіхалагічнай працы. Гэта звязана з нізкім узроўнем "псіхалагічнай пісьменнасці", адсутнасцю разумення таго, як псіхатэрапія можа

дапамагчы ў рэабілітацыі, а таксама з грамадскімі стэрэатыпамі аб тым, што "псіхалагічная дапамога - гэта для слабых".

Асуджаныя часта могуць адмаўляць свае праблемы ці быць негатовымі раскрываць асабістыя перажыванні і траўмы, што абцяжарвае паспяховае ўзаемадзеянне і галбальна працэс выпраўлення ў адведзены для гэтага час зняволення.

6. Абмежаваныя магчымасці для рэабілітацыі і рэсацыялізацыі, а пасля 2020 года практычна зведзеныя да нуля.

Ва ўмовах турмаў і калоній Беларусі псіхолагі сутыкаюцца з абмежаванымі магчымасцямі для рэалізацыі праграм рэабілітацыі. Нават калі такія праграмы існуюць, іх ахоп і якасць могуць быць нізкімі з-за недахопу рэсурсаў, недастатковай кваліфікацыі спецыялістаў і недахопу часу на індывідуальную працу з асуджанымі.

Асуджаныя часта сутыкаюцца з праблемамі сацыяльнай адаптацыі пасля вызвалення, а праграмы псіхалагічнай дапамогі часцей накіраваныя на фармальныя запаўненні, чым на  дапамогу чалавеку ў  падрыхтоўцы да рэальнага жыцця па-за турмой.

7. Адсутнасць міждысцыплінарнага падыходу

Псіхалагічная дапамога ў калоніях Беларусі часта аказваецца ў ізаляцыі ад іншых відаў дапамогі, такіх як медыцынская, сацыяльная, педагагічная ці юрыдычная. Гэта абмяжоўвае эфектыўнасць працы псіхолагаў, паколькі многія асуджаныя могуць мець патрэбу ў комплекснай дапамозе, якая ўключае інтэграцыю некалькіх спецыялістаў.

8. Цяжкасці з ацэнкай і дыягностыкай псіхічных расстройстваў

Многія асуджаныя пакутуюць ад псіхічных захворванняў, якія або не дыягнастуюцца, або недастатковa лечацца ва ўмовах турмаў. Псіхолагі і псіхіятры, якія працуюць у турмах, часта сутыкаюцца з недахопам інструментаў для паўнацэннай дыягностыкі і лячэння. У некаторых выпадках ім даводзіцца працаваць з асуджанымі, чые засмучэнні могуць быць занадта складанымі для самастойнай псіхатэрапеўтычнай працы без удзелу знешніх псіхіятраў.

9. Прававыя абмежаванні і абмежаванні па канфідэнцыяльнасці

У некаторых выпадках праца псіхолага ў калоніях абмежавана прававымі нормамі і патрабаваннямі да канфідэнцыйнасці. Напрыклад, асуджаныя не абавязаны дзяліцца інфармацыяй аб сваім жыцці падчас следства ці на допытах, што можа абмежаваць свабоду зносін з псіхолагам. Сёняшнія патрабаванні ад аператыўных супрацоўнікаў ствараюць дадатковыя складанасці ў рабоце псіхолагаў, якім даводзіцца знаходзіць баланс паміж прафесійнай этыкай і патрабаваннямі аператыўнікаў.

Псіхолагі ў беларускіх калоніях сутыкаюцца з мноствам цяжкасцей, якія могуць негатыўна адбівацца на эфектыўнасці іх працы. Складанасці з рэсурсамі,

псіхалагічным выгараннем, нізкім узроўнем даверу з боку асуджаных і палітычнымі рызыкамі робяць іх працу больш складанай, мала эфектыўнай, што стварае глебу для профдэфакмацыі і нізкага ўзроўню кваліфікацыі саміх псіхолагаў.

Праверка псіхолагаў на адпаведнасць пасады ў турэмнай сістэме - гэта важны працэс, які дапамагае пераканацца, што спецыялісты валодаюць неабходнымі кваліфікацыямі, навыкамі і этычнымі стандартамі для працы з асуджанымі. Ва ўмовах пенітэнцыярнай сістэмы гэта асабліва важна, паколькі праца псіхолага патрабуе высокага ўзроўню прафесіяналізму і ўмення працаваць з людзьмі, якія знаходзяцца ў крызісных і стрэсавых станах.

## Ключавыя аспекты, якія могуць дапамагчы беларускім псіхолагам працаваць больш эфектыўна

1. Кваліфікацыя, адукацыя і сертыфікацыя

Адукацыя: псіхолаг павінен мець адпаведную вышэйшую адукацыю ў галіне псіхалогіі, пераважна з ухілам у клінічную псіхалогію, псіхатэрапію, псіхадыягностыку або іншую сумежную вобласць. У Беларусі, як і ў іншых краінах, важна, каб спецыяліст меў дыплом аб вышэйшай адукацыі ў галіне псіхалогіі, а таксама прайшоў прафесійную атэстацыю менавіта ў пенітэнцыярнай сістэме.

Сертыфікацыя: псіхолаг павінен прайсці спецыялізацыю на ажыццяўленне прафесійнай дзейнасці ў турэмнай псіхалогіі. У некаторых краінах існуюць дзяржаўныя ці галіновыя сертыфікаты для псіхолагаў, якія працуюць у сферы псіхічнага здароўя ў пенітэнцыярных установах. Нажаль, у сёняшніх умовах такія падыходы для беларускай сістэмы нерэалізуемыя.

2. Прафесійны досвед

Праца ў галіне турэмнай псіхалогіі: праверка досведу працы псіхолага ва ўстановах з падвышанымі патрабаваннямі (напрыклад, турмы, папраўчыя калоніі, псіхіятрычныя ўстановы) з'яўляецца важным элементам працы са зняволенымі. Досвед працы з асуджанымі, людзьмі з псіхічнымі засмучэннямі ў зняволенні, залежнасцямі ці траўмамі можа быць вырашальным фактарам.

Стажыроўка і практыка: для пасады турэмнага пісхолага неабходна прайсці практычную стажыроўку ў турэмнай або псіхіятрычнай сістэме. Гэта можа быць дадатковым пацвярджэннем кваліфікацыі псіхолага.

3. Прафесійныя навыкі

Ацэнка навыкаў псіхолага ўключае ў сябе праверку навыкаў дыягностыкі і псіхатэрапеўтычнай працы: псіхолаг павінен умець праводзіць псіхалагічныя тэсты і адзнакі стану асуджаных, а таксама распрацоўваць індывідуальныя праграмы лячэння і рэабілітацыі.

Веданне псіхапаталогіі: разуменне розных псіхічных расстройстваў і станаў, такіх як дэпрэсія, шызафрэнія, расстройствы асобы, посттраўматычныя стрэсавы расстройствы, алкагольная і наркатычная залежнасць менавіта ў зняволеных.

Псіхалагічныя метады і тэхнікі: псіхолаг павінен быць знаёмы з эфектыўнымі метадамі працы з асуджанымі, такімі як кагнітыўна-паводніцкая тэрапія, арт-тэрапія, групавыя і індывідуальныя заняткі.

Навыкі крызіснага ўмяшання: ва ўмовах турмы і калоніі важна, каб псіхолаг быў гатовы да працы ў крызісных сітуацыях, такіх як суіцыдальныя настроі, агрэсія, ці іншыя экстраныя псіхалагічныя станы.

4. Псіхалагічная ўстойлівасць

Эмацыйная сталасць і ўстойлівасць: праца псіхолага ва ўмовах турмы ці папраўчай калоніі можа быць вельмі стрэсавай. Таму важна, каб псіхолаг валодаў добрай псіхалагічнай устойлівасцю, быў здольны спраўляцца з эмацыйнымі перагрузкамі і выгараннем. Гэта можна ацаніць на аснове асабістых інтэрв'ю, псіхадыягнастычных метадаў ці назіранняў за яго працай.

Уменне працаваць з траўміраванымі людзьмі: псіхолаг павінен быць гатовы да працы з асуджанымі, якія могуць адчуваць псіхічнае расстройства, траўмы або стрэсы, звязаныя з іх мінулым. Гэта можа запатрабаваць асаблівага падыходу, адчувальнасці і цярпімасці.

5. Этыка і прафесійныя стандарты

Прафесійная этыка: псіхолаг павінен выконваць высокія стандарты прафесійнай этыкі, у тым ліку канфідэнцыйнасць, павага да асобы асуджаных, сумленнасць і аб'ектыўнасць у сваёй працы.

Захаванне стандартаў працы ў пенітэнцыярнай сістэме: псіхолаг, які працуе ў турмах, павінен быць знаёмы з заканадаўствам і правіламі, якія рэгулююць працу ў пенітэнцыярнай сістэме, уключаючы правы асуджаных, метады працы з рознымі тыпамі асуджаных і прынцыпы гуманнага звароту.

6. Ацэнка эфектыўнасці працы

Адзнака вынікаў працы: важна ацэньваць, наколькі эфектыўна псіхолагі дапамагаюць асуджаным. Гэта можна рабіць праз зваротную сувязь ад асуджаных, калег і начальства, а таксама праз рэзультатыўнасць праграмы рэабілітацыі.

Аналіз дынамікі змен: эфектыўнасць псіхолага можна вымераць праз змены ў псіхалагічным стане асуджаных, іх паводзіны, стаўленне да зняволення і поспехі ў праграмах рэабілітацыі.

7. Псіхалагічная дыягностыка і атэстацыя

Псіхалагічныя тэсты і інтэрв'ю: можна правесці серыю псіхалагічных тэстаў і інтэрв'ю з кандыдатам, каб ацаніць яго здольнасці да дыягностыкі і вызначэнні псіхалагічнага стану людзей, з якімі ён будзе працаваць.

Ацэнка асобасных якасцяў: гэта можа ўключаць аналіз асобасных характарыстык кандыдата, такіх як эмпатыя, здольнасць да самакантролю, камунікабельнасць, стрэсаўстойлівасць.

8. Зваротная сувязь ад калег і кіраўніцтва

Водгукі калег і кіраўніцтва: адзін з найважнейшых спосабаў ацэнкі прафесіяналізму - гэта зваротная сувязь ад калег і кіраўніцтва, якія могуць расказаць аб здольнасці псіхолага працаваць у калектыве, яго падыходах да вырашэння задач і ўзаемадзеянні з іншымі супрацоўнікамі.

Праверка псіхолагаў на адпаведнасць пасады ў турмах і пенітэнцыярных установах - гэта шматгранны працэс, які ўключае ацэнку адукацыі, вопыту работы, навыкаў, этычных стандартаў і псіхалагічнай устойлівасці. Важна, каб псіхолагі не толькі валодалі неабходнымі ведамі і навыкамі, але і былі гатовы працаваць ва ўмовах стрэсу, з цяжкімі выпадкамі і асуджанымі з рознымі псіхічнымі расстройствамі.

### Заключэнне

Псіхалагічная дапамога зняволеным у Беларусі існуе ў рамках сістэмы папраўчых установ, але яе даступнасць і якасць могуць пакідаць жадаць лепшага. Гэта звязана з недахопам рэсурсаў, спецыялістаў і складанымі ўмовамі працы. Тым не менш, роля псіхолагаў важная для падтрымання псіхічнага здароўя зняволеных, і праблема паляпшэння псіхалагічнай дапамогі ва ўстановах застаецца актуальнай для праваабарончых арганізацый.

Так, у Беларусі існуюць праграмы псіхалагічнай дапамогі зняволеным, але яны абмежаваныя як па колькасці, так і па якасці з-за шэрагу фактараў, такіх як недахоп спецыялістаў, нізкі ўзровень фінансавання і спецыфічная сітуацыя ў сістэме правасуддзя. Аднак, нягледзячы на гэтыя абмежаванні, у некаторых установах існуюць праграмы і працэдуры, накіраваныя на паляпшэнне псіхаэмацыйнага стану зняволеных.

## Структура пенітэнцыярнай сістэмы ў Эстоніі

Пенітэнцыярная сістэма Эстоніі мае выразную структуру і арганізацыю, якая накіравана на кіраванне папраўчымі ўстановамі, забеспячэнне бяспекі, рэабілітацыю асуджаных і іх падрыхтоўку да паспяховай рэсацыялізацыі. Асноўныя кампаненты пенітэнцыярнай сістэмы Эстоніі ўключаюць розныя віды ўстаноў, якія функцыянуюць пад наглядам Міністэрства юстыцыі Эстоніі.

### Асноўная структура пенітэнцыярнай сістэмы Эстоніі

Пенітэнцыярная сістэма Эстоніі падпарадкавана Міністэрству юстыцыі, якое адказвае за распрацоўку і ўкараненне заканадаўства, якое вызначае ўмовы ўтрымання асуджаных, а таксама за агульную арганізацыю і кантроль над папраўчымі ўстановамі.

Міністэрства юстыцыі таксама распрацоўвае і ўкараняе праграмы рэабілітацыі, адукацыі і працаўладкавання асуджаных, а таксама праводзіць кантроль за правамі чалавека ў турмах і калоніях.

*Галоўнае ўпраўленне турмаў і папраўчых устаноў (Vanglateenistus)*

Пад міністэрствам юстыцыі функцыянуе Галоўнае ўпраўленне турмаў (або Vanglateenistus), якое непасрэдна кіруе пенітэнцыярнымі ўстановамі ў Эстоніі. Яно адказвае за арганізацыю працы ўсіх папраўчых устаноў, у тым ліку турмы і калоніі.

Галоўнае ўпраўленне таксама распрацоўвае і рэалізуе праграмы, накіраваныя на рэсацыялізацыю асуджаных, паляпшэнне ўмоў утрымання і зніжэнне ўзроўню рэцыдывізму.

**Тыпы ўстаноў у пенітэнцыярнай сістэме Эстоніі:**

Эстонская пенітэнцыярная сістэма дзеліцца на некалькі тыпаў устаноў, у залежнасці ад рэжыму бяспекі і прызначэнні.

а) турмы:

турмы ў Эстоніі прызначаны для асуджаных, якія адбываюць пакаранне ва ўмовах строгага рэжыму. Гэтыя ўстановы ахоўваюцца на высокім узроўні, з асаблівай увагай да прадухілення ўцёкаў і забеспячэння грамадскай бяспекі.

б) папраўчыя калоніі:

папраўчыя калоніі ў Эстоніі маюць некалькі відаў:

- адкрытыя калоніі: гэтыя ўстановы прызначаны для асуджаных, якія адбываюць пакаранні за менш цяжкія злачынствы і маюць магчымасць працаваць па-за ўстановай або ўдзельнічаць у рэабілітацыйных праграмах. Умовы ўтрымання тут мякчэйшыя, чым у турмах;
- паўзакрытыя калоніі: яны прызначаны для асуджаных сярэдняй ступені небяспекі і забяспечваюць стражэйшыя ўмовы, але ўсё ж уключаюць элементы рэабілітацыі і працоўнай дзейнасці;
- закрытыя калоніі: гэтыя калоніі прызначаны для асуджаных з высокімі рызыкамі для грамадства або для тых, хто адбывае пакаранні за цяжкія злачынствы.

в) следчыя ізалятары:

следчыя ізалятары ў Эстоніі прызначаны для ўтрымання асоб, якія знаходзяцца пад следствам і чакаюць судовага прысуду. Умовы ўтрымання ў гэтых установах больш

строгія, бо падазроныя яшчэ не былі прызнаныя вінаватымі, але знаходзяцца пад арыштам.

г) калоніі для непаўналетніх:

эстонская сістэма таксама ўключае спецыялізаваныя ўстановы для непаўналетніх злачынцаў, у якіх яны могуць адбываць пакаранне ва ўмовах, спецыяльна адаптаваных для іх узросту і запатрабаванняў.

## Рэабілітацыя і рэсацыялізацыя

Адзін з асноўных аспектаў працы пенітэнцыярнай сістэмы Эстоніі - гэта рэабілітацыя асуджаных. Для гэтага ў папраўчых установах дзейнічаюць розныя праграмы, накіраваныя на аднаўленне асуджаных, іх падрыхтоўку да жыцця пасля вызвалення і зніжэнне рэцыдывізму. Да такіх праграм адносяцца:

Адукацыйныя праграмы: навучанне грамаце, прафесійнае навучанне і курсы па павышэнні кваліфікацыі.

Працоўная рэабілітацыя: асуджаныя могуць працаваць на тэрыторыі калоній ці ў іншых месцах, што дапамагае ім развіць навыкі і забяспечыць сродкі да існавання.

Псіхалагічная дапамога: праграмы псіхатэрапеўтычнай дапамогі, уключаючы лячэнне залежнасцяў і карэкцыю антысацыяльных паводзін.

Праграмы сацыяльнай адаптацыі: дапамога ў падрыхтоўцы да вызвалення, уключаючы кансультацыі па працаўладкаванні, жыллі і аднаўленні сацыяльных сувязяў.

## Кадры і ахова

Персанал, які працуе ў эстонскіх пенітэнцыярных установах, уключае ахоўнікаў, сацыяльных работнікаў, псіхолагаў, педагогаў і медперсанал. Адмысловая ўвага надаецца падрыхтоўцы супрацоўнікаў да працы ва ўмовах падвышанай бяспекі і з асуджанымі, якія маюць розныя псіхалагічныя і сацыяльныя праблемы.

## Якасць жыцця асуджаных і кантроль за ўмовамі ўтрымання

Эстонія робіць акцэнт на захаванні правоў чалавека і паляпшэнні ўмоў утрымання ў турмах і калоніях. Для гэтага праводзіцца пастаянны маніторынг умоў, у тым ліку з удзелам незалежных назіральнікаў, такіх як прадстаўнікі амбудсмэна ці міжнародных арганізацый па правах чалавека.

## Міжнароднае супрацоўніцтва

Эстонія актыўна супрацоўнічае з іншымі краінамі і міжнароднымі арганізацыямі ў галіне правоў чалавека і пенітэнцыярнай палітыкі. У прыватнасці, краіна ўдзельнічае ў

праектах Еўрапейскага Саюза і Савета Еўропы, накіраваных на паляпшэнне пенітэнцыярных сістэм і выкананне стандартаў правоў чалавека.

Эстонская пенітэнцыярная сістэма арыентавана на рэабілітацыю асуджаных і іх паспяховую інтэграцыю ў грамадства пасля вызвалення.

## Аказанне псіхалагічнай дапамогі асуджаным у эстонскай пенітэнцыярнай сістэме

У Эстоніі аказанне псіхалагічнай дапамогі асуджаным з'яўляецца важнай часткай пенітэнцыярнай сістэмы, накіраванай на рэабілітацыю і рэсацыялізацыю. Псіхалагічная падтрымка разглядаецца як неад'емная частка працэсу выпраўлення, паколькі яна дапамагае асуджаным зразумець прычыны іх паводзін, справіцца з эмацыйнымі і псіхічнымі цяжкасцямі, а таксама падрыхтавацца да жыцця пасля вызвалення.

Асноўныя аспекты аказання псіхалагічнай дапамогі ў эстонскай пенітэнцыярнай сістэме:

1. Псіхалагічная дапамога як частка рэабілітацыі: у Эстоніі асуджаным даецца магчымасць прайсці псіхалагічнае кансультаванне, якое з'яўляецца часткай праграмы рэабілітацыі ў папраўчых установах. Гэта дапамагае ім не толькі справіцца з наступствамі злачыннай дзейнасці, але і разабрацца з асабістымі праблемамі, такімі як залежнасці, стрэсы, дэпрэсіі, міжасобасныя канфлікты.
2. Псіхалагічнае тэсціраванне і ацэнка: у пачатку адбывання пакарання асуджаныя могуць праходзіць псіхалагічнае тэсціраванне, якое дазваляе вызначыць іх псіхаэмацыйны стан, а таксама рызыкі для грамадскай бяспекі (напрыклад, схільнасць да гвалту). Гэтыя дадзеныя дапамагаюць распрацаваць індывідуальную праграму рэабілітацыі.
3. Індывідуальнае і групавое кансультаванне: у залежнасці ад стану асуджанага і яго патрэбнасцей, прадастаўляецца або індывідуальнае кансультаванне, або групавая тэрапія. Індывідуальныя заняткі часта накіраваны на працу з асабістымі праблемамі, у той час як групавыя заняткі могуць дапамагаць асуджаным развіваць навыкі ўзаемадзеяння з іншымі людзьмі, паляпшаць камунікацыю і вучыць канструктыўнаму вырашэнню канфліктаў.
4. Праграмы рэабілітацыі і аднаўленне псіхалагічнага стану: у эстонскіх папраўчых установах распрацаваны спецыяльныя праграмы для асуджаных, накіраваныя на лячэнне залежнасцяў, пераадоленне агрэсіі і жорсткасці, а таксама на аднаўленне псіхаэмацыйнага стану пасля знаходжання ва ўмовах зняволення. Праграмы часта ўключаюць элементы кагнітыўна-паводніцкай тэрапіі (КПТ), якая дапамагае асуджаным змяняць свае паводзіны і светапогляд.
5. Навучанне кіраванню эмоцыямі і стрэсам: эмацыйнае і псіхалагічнае аднаўленне з'яўляецца важнай часткай агульнай праграмы рэабілітацыі. Асуджаным даюцца трэнінгі і заняткі, накіраваныя на кіраванне эмоцыямі, развіццё эмпатыі і самакантролю. Гэта ўключае ў сябе навучанне метадам

паслаблення, медытацыі, а таксама практычным навыкам барацьбы з агрэсіяй і стрэсам.
6. Падтрымка для асуджаных з псіхічнымі расстройствамі: асаблівая ўвага надаецца асуджаным з псіхічнымі захворваннямі. Для іх могуць быць распрацаваны асобныя праграмы або прапанаваны больш інтэнсіўныя формы псіхатэрапеўтычнай дапамогі, у тым ліку медыцынскае ўмяшанне, калі гэта неабходна. Такія асуджаныя могуць знаходзіцца ў спецыялізаваных установах, дзе ўмовы і дапамога больш прыдатныя для іх стану.
7. Роля сацыяльных работнікаў і псіхолагаў: у эстонскіх пенітэнцыярных установах працуюць не толькі псіхолагі, але і сацыяльныя работнікі, якія дапамагаюць асуджаным адаптавацца да жыцця ў турме, падтрымліваюць падчас рэабілітацыі і працуюць над пытаннямі сацыяльнай інтэграцыі. Гэта дапамагае стварыць комплексную сістэму падтрымкі, якая ахоплівае ўсе аспекты жыцця асуджанага.
8. Праграмы падрыхтоўкі да вызвалення: важна адзначыць, што псіхалагічная дапамога таксама накіравана на падрыхтоўку асуджаных да жыцця пасля вызвалення. Гэта ўключае кансультаванне па пытаннях сацыяльнай адаптацыі, працаўладкавання, падтрымання адносін з сям'ёй і іншымі важнымі аспектамі. Да гэтага працэсу могуць быць падключаны сацыяльныя работнікі, псіхатэрапеўты і іншыя спецыялісты.
9. Псіхалагічнае суправаджэнне супрацоўнікаў турмаў: у Эстоніі таксама надаецца ўвага псіхалагічнаму стану супрацоўнікаў пенітэнцыярных устаноў. Паколькі праца ў такіх установах спалучана з высокай эмацыйнай нагрузкай, псіхалагічная падтрымка для персанала дапамагае прадухіляць выгаранне і стрэс.

## Асноўныя выклікі і праблемы

Недахоп адмыслоўцаў: нягледзячы на развіццё сістэмы псіхалагічнай дапамогі, у некаторых выпадках назіраецца недахоп адмыслоўцаў, што можа абмяжоўваць даступнасць такіх паслуг для ўсіх асуджаных.

Цяжкасці з індывідуалізацыяй праграм. Часам складана адаптаваць праграмы псіхалагічнай дапамогі да індывідуальных запатрабаванняў кожнага асуджанага, асабліва калі ў яго маюцца сур'ёзныя псіхічныя засмучэнні ці складаная гісторыя злачынстваў.

## Вынікі і перспектывы

Сістэмы псіхалагічнай дапамогі ў Эстоніі, нягледзячы на выклікі, ідуць у бок паляпшэння ўмоў рэабілітацыі. Праграмы дапамагаюць асуджаным не толькі справіцца з асабістымі праблемамі, але і знізіць рызыкі рэцыдывізму, што ў сваю чаргу садзейнічае агульнай бяспецы ў грамадстве. У перспектыве плануецца далейшае паляпшэнне псіхасацыяльнай падтрымкі, а таксама павышэнне ўзроўню кваліфікацыі спецыялістаў, якія працуюць у сістэме.

Такім чынам, псіхалагічная дапамога ў эстонскай пенітэнцыярнай сістэме адыгрывае ключавую ролю ў працэсе рэабілітацыі асуджаных і іх падрыхтоўцы да вяртання ў грамадства.

## Прапановы для зменаў у пенітэнцыярную сістэму Беларусі

Абапіраючыся на сваю чатырохгадовую даследчую працу, у тым ліку глыбіннае даследаванне літоўскай, польскай, нямецкай і эстонскіх пенітэнцыярных сістэм, а таксама псіхатэрапеўтычную працу з былымі беларускімі зняволенымі і членамі іх сем'яў, прапаную наступныя напрамкі для ўдасканалення беларускай сістэмы.

1. Перавесці аказанне медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі для абвінавачаных і асуджаных пад юрысдыкцыю Міністэрства аховы здароўя з кантролем выканання пратаколаў аказання паслуг.

2. Пашырыць грамадскі кантроль за пенітэнцыярнымі ўстановамі ў Беларусі праз ўключэнне ў маніторынгавыя групы дактароў і псіхолагаў.

3. Дапусціць у пенітэнцыярныя ўстановы даследчыкаў для пашырэння акадэмічнага і навуковага асяроддзя ў тэме ўздзеяння абмежавання або пазбаўлення людзей свабоды і ўплыву гэтых працэсаў як на саму асобу, так і на грамадства ў цэлым.

4. Забяспечыць сістэму абавязковага праходжання псіхалагічнай дыягностыкі для супрацоўнікаў пенітэнцыярных устаноў Беларусі з мэтай зніжэння іх прафнепрыдатнасці і абавязковай сертыфікацыяй.

Паколькі праца ў пенітэнцыярных установах спалучана з высокай эмацыйнай нагрузкай, псіхалагічная падтрымка для працаўнікоў дапамагае прадухіляць выгаранне і стрэс. Такім чынам, важна забяспечыць умовы для атрымання такой падтрымкі для работнікаў саміх устаноў.

5. Пашырыць праграмы павышэння кваліфікацыі для супрацоўнікаў пенітэнцыярных устаноў у Беларусі.

6. Адказнасць за аказанне медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі ўскласці на начальніка медыцынскай службы пенітэнцыярных устаноў.

7. Унутры пенітэнцыярных установаў галоўнай службай зрабіць сацыяльна-псіхалагічную замест аператыўнай.

8. Удасканаліць працэсы аказання псіхалагічнай дапамогі зняволеным з мэтай зніжэння паўторных рэцыдываў у частцы распрацоўкі адзіных стандартаў многафункцыянарнай сацыялізацыі і рэсацыялізацыі пасля вызвалення.

9. Абавязкова ўвесці супервізійную падтрымку для пенітэнцыярных псіхолагаў і абавязковую атэстацыю ў прафесійным нетурэмным асяроддзі.

10. Змяніць умовы працы для асуджаных, каб яны адпавядалі Працоўнаму кодэксу краіны.

11. Дэпартаменту выканання пакаранняў прывесці ў адпаведнасць сайт, каб там адлюстроўвалася уся інфармацыя аб беларускай пенітэнцыярнай сістэме, у тым ліку прававыя дакументы, якія рэгулююць атрыманне медыцынскай і псіхалагічнай дапамогі. На канец 2024 года на сайце дэпартамента змяшчаецца выключна камерцыйная структура дэпартамента, накіраваная на атрыманне прыбытку ад працы асуджаных. Таксама варта публічна размясціць справаздачу, якая тычыцца медыцынскіх і псіхалагічных паслуг, якія аказваюцца зняволеным.

12. Унесці прапановы ў парламент аб змене заканадаўства для гуманізацыі пакарання для жанчын: утрыманне пад вартай і пазбаўленне свабоды прымяняць у выключных выпадках, калі справа тычыцца асабліва цяжкага злачынства і рэцэдыва.